ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (326) | Субота, 17 сакавіка 1979 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ФАКУЛЬТЭТУ ФІЗВЫХАВАННЯ—30 ГАДОЎ



За гады існавання на факультэце фізічнага выхавання падрыхтавана больш дзвюх з палавінай тысяч высакакваліфікаваных спецыялістаў. Яны плённа выкарыстоўваюць свае веды і вопыт у справе фізічнага ўдасканальвання маладога пакалення. Многія былыя выпускнікі факультэта паспяхова працуюць у нашым універсітэце.

**НА ЗДЫМКУ:** група выкладчыкаў і студэнтаў факультэта фізвыхавання.

Фота Б. Шкурко.

Сёння на факультэце фізвыхавання — свята. Яго калектыў адзначае свой 30-гадовы юбілей. Тры дзесяцігоддзі таму назад у мэтах павелічэння падрыхтоўкі спецыялістаў фізічнай культуры з вышэйшай адукацыяй быў адкрыт факультэт фізвыхавання пры былым педінстытуце імя В. П. Чкалава.

Цяпер выпускнікоў факультэта фізвыхавання можна сустрэць у многіх школах горада і вобласці, прафесійна - тэхнічных вучылішчах, вышэйшых навучальных установах, на кіруючых пасадах у фізкультурных арганізацыях не толькі Гомеля і вобласці, а нават рэспублікі і краіны. На факультэце атрымалі адукацыю многія вядомыя спартсмены, праславіўшыя нашу Радзіму выдатнымі спартыўнымі дасягненнямі. Перш за ўсё — гэта алімпійскі чэмпіён, неаднаразовы пераможца чэмпіянатаў свету, Еўропы і Савецкага Саюза па веславанню Л. Гейштар, чэмпіён краіны і ўладальнік Кубка Еўропы ў бегу на 100 м В. Сапея, чэмпіён кантынента А. Маркаўцоў, адзін з мацнейшых бегуноў Еўропы на 400-метровай дыстанцыі з бар'ерамі, удзельнік Алімпійскіх гульняў Я. Гаўрыленка, чэмпіёны СССР розных гадоў В. Паўлючкоў, В. Харытонаў, Л. Калашнікаў, А. Гольцаў і многія іншыя. Факультэт фізвыхавання закончыў і першы ў рэспубліцы суддзя міжнароднай катэгорыі па баскетболу Б. Царыкаў. Дэканам факультэта з'яўляецца былы яго выпускнік кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Б. М. Зайцаў.

З году ў год расце майстэрства выхаванцаў факультэта. Сярод іх—1 заслужаны майстар спорту СССР, 2 майстры спорту міжнароднага класа, 44 майстры спорту СССР і 77 кандыдатаў у майстры, 98 першаразраднікаў. Хаця мы шмат прыводзім лічбаў, усё ж нельга не сказаць, што за апошнія 10 год (калі факультэт фізвыхавання стаў падраздзяленнем утворанага на базе педінстытута Гомельскага універсітэта) тут падрыхтавана 82 майстры і 192 кандыдаты ў майстры спорту СССР, звыш 500 першаразраднікаў.

Рост спартыўнай кваліфікацыі студэнтаў у многім залежыць ад педагогаў. На чатырох кафедрах факультэта працуюць вопытныя, добра ведаючыя сваю справу выкладчыкі. Сярод іх — доктар медыцынскіх навук прафесар А. С. Калугін, сем кандыдатаў навук, дацэнтаў, 15 майстроў спорту СССР, 12 выдатнікаў фізічнай культуры. Сярод маладых выкладчыкаў — большасць былых выпускнікоў факультэта.

Выкладчыцкі састаў факультэта жыве клопатамі падрыхтоўкі да летняй Алімпіяды-80, якая ўпершыню адбудзецца ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве. Свае намаганні яны накіроўваюць на тое, каб як мага вышэй узняць спартыўныя дасягненні сваіх выхаванцаў. Вялікія надзеі ўскладваюцца на майстра спорту міжнароднага класа Н. Трахіменак, заслужанага майстра спорту В. Вараб'ёва, якія выступаюць у камандзе весляроў на байдарках і каноэ, аднаго з мацнейшых бегуноў краіны на сярэдніх дыстанцыі, чэмпіёна няўдана прайшоўшага ў Мінску першынства краіны па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях М. Кірава, бронзавага прызера гэтых спаборніцтваў А. Вераб'я і іншых, чые імёны шырока вядомы сапраўдным аматарам спорту, хто можа з гонарам пастаяць за славу савецкага спорту. Прыемна ўсведамляць, што шэсць лепшых спартсменаў факультэта ўключаны кандыдатамі ў алімпійскую каманду СССР.

**І. ТРАФІМОВІЧ,**
**сакратар партбюро факультэта фізвыхавання.**

## ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»

## ВЫЗНАЧАН АБ'ЁМ РАБОТЫ

Нядаўна адбыўся сход работнікаў бібліятэкі універсітэта. На ім абмеркавана пытанне аб падрыхтоўцы да камуністычнага суботніка, прысвечанага 109-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. З паведамленнем па гэтаму пытанню выступіла загадчыца бібліятэкі В. М. Касцючэнкава. Яна расказала аб традыцыі правядзення свята працы, заклікала прысутных актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку да яго. Затым сумесна з загадчыкамі аддзелаў быў складзен план правядзення суботніка, вызначаны ўчасткі работ. Як і ў мінулыя гады, супрацоўнікі бібліятэкі будуць заняты на гаспадарчых работах у памяшканнях бібліятэкі, прымуць удзел у азеляненні тэрыторыі універсітэта. Удзельнікі сходу аднагалосна вырашылі правесці свята працы дружна і арганізавана.

## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Учора адбылася навукова-метадычная канферэнцыя «Удасканаленне сістэмы фізічнага выхавання студэнцкай моладзі», прысвечаная 30-годдзю факультэта фізвыхавання. Уступным словам яе адкрыў дэкан факультэта дацэнт Б. М. Зайцаў. Ён расказаў аб станаўленні і развіцці факультэта за 30 гадоў.

На канферэнцыі былі заслуханы даклады загадчыка кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны доктара медыцынскіх навук, прафесара А. С. Калугіна, загадчыка кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання кандыдата педагагічных навук, дацэнта А. Ф. Сямікопа, загадчыка кафедры фізічнага выхавання кандыдата педагагічных навук В. А. Каляды, старшых выкладчыкаў У. У. Макарэвіча, В. Д. Падасінава і іншых спецыялістаў фізічнай культуры.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

## НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

На біялагічным факультэце прайшла камсамольская атэстацыя па трэцяму этапу Ленінскага заліку пад дэвізам: «Рашэнні XXV з'езда КПСС—у жыццё!». Своечасова былі створаны атэстацыйныя камісіі ў групах і на факультэце, у склад кожнай з якіх увайшлі прадстаўнікі партыйнага і камсамольскага бюро факультэта, куратар і камсорг групы, быў складзен графік правядзення атэстацыі. Усё гэта дало добры плён. Камсамольская атэстацыя на нашым факультэце прайшла на высокім арганізацыйным узроўні. Камсамольцы вялі канкрэтную размову аб тым, як палепшыць вучэбна-выхаваўчы працэс, дзяліліся вопытам складання асабістых творчых планаў, гаварылі аб праводзімай на факультэце грамадскай рабоце. Выказаны крытычныя заўвагі ў адрас тых камсамольцаў, якія не добрасумленна аднесліся да адказнага мерапрыемства. Напрыклад, у групе Б-22, дзе камсоргам Кульчыцкая, на камсамольскую атэстацыю без асаблівай на тое прычыны не з'явіўся студэнт Д. Мацвіенка. Выпадкі неахайнасці ў паводзінах і вучобе гэтага камсамольца назіраліся не раз. Тым не менш станоўчых вывадаў не было зроблена. Камсамольцы групы вырашылі абмеркаваць паводзіны студэнта Мацвіенкі на пасяджэнні камсамольскага бюро факультэта.

Камсамольская атэстацыя з'явілася сур'ёзным экзаменам на права быць дастойным прадаўжальнікам слаўных традыцый нашых старэйшых таварышаў—камуністаў.

**Г. КАЧМАРОВА,**
**студэнтка групы Б-11 біялагічнага факультэта.**

## ПА АКТУАЛЬНАЙ ПРАБЛЕМЕ

Лубін і праблемы бялку—такая тэма была вынесена для абмеркавання ўдзельнікаў навукова-вытворчай абласной канферэнцыі, якая адбылася нядаўна ў актавай зале нашага універсітэта. Канферэнцыя была падрыхтавана па ініцыятыве аграбіялагічнай станцыі «Старыя Чонкі» ГДУ сумесна з упраўленнем сельскай гаспадаркі аблвыканкома, Гомельскай і Палесскай сельскагаспадарчымі доследнымі станцыямі.

З дакладам «Вытворчасць лубіну ў Гомельскай вобласці» выступіў галоўны аграном упраўлення сельскай гаспадаркі аблвыканкома С. І. Бажычка. Каштоўныя думкі выказалі супрацоўнікі АН БССР доктар біялагічных навук Л. В. Міроненка, кандыдат біялагічных навук М. А. Ламан, супрацоўнік Беларускага інстытута земляробства Г. К. Шутоў, спецыяліст Палесскай доследнай станцыі В. А. Еўдакіменка. Вынікі канферэнцыі падвёў начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі аблвыканкома І. П. Салёнаў. Ён адзначыў важнасць правядзення падобных мерапрыемстваў і падзякваў прадстаўнікам нашага універсітэта за добрую арганізацыю канферэнцыі.

**М. БАЙДА,**
**дырэктар аграбіялагічнай станцыі «Старыя Чонкі» ГДУ.**

## ПАГЛЫБЛЯЮЦЬ ФІЛАСОФСКІЯ ВЕДЫ

Вучэбны працэс у вышэйшай школе прадугледжвае не толькі паспяховае авалоданне вучэбнай праграмай, але і актыўны ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце. З гэтай мэтай на факультэтах ствараюцца шматлікія гурткі. У іх студэнты пашыраюць свае веды па дысцыплінах, з якімі знаёмяцца на лекцыях і семінарскіх занятках. Адзін з такіх гурткоў—філасофскі — працуе пры кафедры філасофіі. Кіруе ім кандыдат філасофскіх навук Р. Я. Мінянкоў. На сваіх пасяджэннях гуртоўцы абмяркоўваюць даклады і рэфераты па праблемах філасофскай думкі, больш глыбей вывучаюць спадчыну класікаў марксізму-ленінізму. Заняткі заўсёды праходзяць ажыўлена, пры высокай актыўнасці членаў гуртка. Некалькі апошніх заняткаў былі прысвечаны праблеме гістарызму ў філасофіі. З цікавымі паведамленнямі выступілі студэнты 3-га курса гістфіла А. Кузьміч, С. Расадзін і іншыя. Вынікі гутаркі падвёў Р. Я. Мінянкоў. Ён адзначыў творчы рост студэнтаў у напісанні рэфератаў, уменне правільна будаваць лагічныя развагі, дакладна разглядаць асноўныя пытанні філасофіі.

**Б. РЫБАК,**
**студэнт 3-га курса гістфіла, член філасофскага гуртка.**

